# СПОСАБЫ ВЫРАЖЭННЯ ПАБУДЖАЛЬНАЙ ІНТЭНЦЫІ КАТЭГАРЫЧНАГА ДЫРЭКТЫЎНАГА ТЫПУ Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

***Сyконкіна Н.М.,***
*магістрант ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Зіманскі В.Э., канд. філал. навук, дацэнт

Пабуджальнасць – універсальная моўная катэгорыя: пабуджальныя маўленчыя акты выкарыстоўваюць носьбіты любой культуры, хаця спосабы выражэння пабуджальнай інтэнцыі адрозніваюцца ў розных мовах, што звязана з уласцівымі кожнай культуры своеасаблівымі рысамі, замацаванымі этычнымі, этыкетнымі нормамі. Спосабы рэалізацыі катэгорыі пабуджальнасці ў беларускай мове амаль не вывучаліся, за выключэннем нешматлікіх прац [1].

Мэта даследавання – апісаць спосабы выражэння пабуджальнай інтэнцыі катэгарычнага дырэктыўнага тыпу ў беларускай мове.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання сталі выказванні са значэннем пабуджэння да дзеяння, выбраныя з твораў беларускага празаіка В. Праўдзіна. Пры правядзенні даследавання выкарыстоўваліся агульныя (апісанне, супастаўленне) і прыватныя метады (кампанентнага аналізу, аналізу камунікатыўнай сітуацыі, кантэкстуальнага аналізу, функцыянальна-прагматычнага аналізу).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У адносінах да адрасата адрасант можа ставіць сябе ў камунікатыўна больш высокую ці нізкую пазіцыю або камунікаваць на роўных. Камунікатыўная пазіцыя – пазіцыя адрасанта ў адносінах да адрасата паведамлення – залежыць як ад сацыяльнага статусу камунікантаў, так і дыктуецца самой сітуацыяй зносін (напрыклад, адзін з удзельнікаў камунікацыі можа адчуваць маральную перавагу над суразмоўцам). Ад камунікатыўнага статусу ўдзельнікаў размовы залежыць ступень уздзеяння на адрасата: высокі камунікатыўны статус адрасанта паведамлення ўплывае на абавязковасць выканання дзеяння адрасатам, немагчымасць адмовіцца ад яго. У сувязі з гэтым даследчыкі падзяляюць выказванні са значэннем пабуджэння да дзеяння на некалькі груп, адна з якіх аб’ядноўвае выказванні, у якіх пабуджальнасць выражана катэгарычна, адрасант займае больш высокую камунікатыўную пазіцыю, а ў адрасата адсутнічае свабода выбару. У такіх выказваннях рэалізуецца пабуджальная інтэнцыя дырэктыўнага тыпу [2]. Пабуджальная інтэнцыя дырэктыўнага тыпу характэрна для наступных маўленчых актаў: загад, распараджэнне, дазвол, забарона, інструкцыя, прадпісанне, заказ, патрабаванне, каманда, указанне.

Самы распаўсюджаны спосаб перадачы пабуджальнай інтэнцыі дырэктыўнага тыпу ў беларускай мове – выказванні з дзеясловамі ў форме загаднага ладу.

*– **Крутніся**, Віцька, **паглядзі**, што да чаго, – загадаў Нігурэй. – Мо і не прыснілася бабе* [3, с. 83].

Для перадачы пабуджальнай інтэнцыі такога тыпу могуць выкарыстоўвацца канструкцыі з перфарматыўнымі дзеясловамі.

*Гамана сціхла, і паліцай адрывіста закрычаў: “Мы вядзём на расстрэл ворагаў рэйха, таму ўсім **загадваю** весяліцца…* [3, с. 111].

*– Я – супрацоўнік Міністэрства замежных спраў Вітар Віктаравіч Аляксандраў і **патрабую, каб** вы пазванілі майму непасрэднаму…*

*– …начальніку, – скончыў фразу за Трухана Светлы* [3, с. 418].

У апошнім сказе дзеянне, якое павінна быць выканана, называецца ў дадана́й дапаўняльнай частцы складаназалежнага сказа, якая далучаецца да галоўнай пры дапамозе злучніка “каб”. Такі спосаб перадачы волевыяўлення характэрны для

беларускай мовы, у тым ліку выкарыстоўваецца для выражэння пабуджальнай інтэнцыі дырэктыўнага тыпу.

*– Ну і метады работы! – рыкнуў генерал і раздражнёна крутнуўся да выхаду. У дзвярах Рашэтнікаў на хвіліну прыпыніўся: – Даю паўгадзіны,* ***каб*** *ачысціць аддзел ад п'яні, і чакаю ў сябе з тлумачэннямі* [3, с. 333].

Нярэдка загад, каманда, прадпісанне і падобныя маўленчыя акты рэалізуюцца шляхам выкарыстання канструкцый з інфінітывам.

*Раман прыклаў палец да вуснаў і прашаптаў:*

*–* ***Сядзець ціха****! Дзе другі?* [3, с. 94].

Названыя маўленчыя акты могуць быць выражаны праз выкарыстанне выказванняў з семантыкай неабходнасці, абавязковасці выканання дзеяння.

*Ён убачыў Мікуліча, Трухана, страляючага па машыне сержанта, дзяжурнага маёра, які крычыць па радыёстанцыі: "Усім пастам і нарадам* ***неабходна затрымаць*** *перламутравы джып, у якім узброеныя злачынцы ў міліцэйскай форме…"* [3, с. 462].

*– Не хвалюйцеся, мы вам верым, – запэўніў наведвальніка Хмара, – толькі цяпер вы* ***павінны*** *ўсё* ***расказаць*** *з самага пачатку, нічога не прапусціўшы…* [3, с. 371].

Пабуджальная інтэнцыя дырэктыўнага тыпу можа ўтрымлівацца і ў апавядальных сказах, у якіх прэдыкат выражаны дзеясловам у форме абвеснага ці ўмоўнага ладу.

*– Ну што,* ***пайшлі****, – выходзячы з "уазіка", сказаў я шафёру* [3, с. 185].

*Лукін сеў за стол, узяў чысты аркуш паперы і хутка намаляваў на ім некалькі квадрацікаў. – Самы час размеркаваць абавязкі. Ты, Ігнат Улдзіміравіч,* ***зоймешся*** *"Венерай"* [3, с. 316].

*– Вы* ***б****, таварыш маёр,* ***саблюдалі*** *субардынацыю, – строга прамовіў Навіцкі* [3, с. 95].

Даволі распаўсюджаны спосаб выражэння пабуджэння да дзеяння – выкарыстанне бяздзеяслоўных канструкцый. У выказваннях з пабуджальнай інтэнцыяй катэгарычнага тыпу значэнне пабуджэння могуць перадаваць самыя розныя часціны мовы.

*–* ***Напра-а-ва****! У вагон сямнаццаць* ***шагам марш****! – камандуе прапаршчык* [3, с. 73].

*І сапраўды, праз дзве гадзіны званок у дзверы. Я крычу ў перагаворнае:*

*–* ***Пароль****! – крычу я. – Інакш трывогу падымаю* [3, с. 158].

*Гаспадыня прыпынілася, прыхільна паглядзела на Хмару:*

*– Памажы, унучак, а то…*

*–* ***Цыц****, баба! – гнеўна перапыніў жонку стары. – Чалавек на дзяржаўнай службе, гэта табе не блінцы на патэльні пераварочваць…* [3, с. 212].

**Заключэнне.** Такім чынам, пабуджальная інтэнцыя катэгарычнага дырэктыўнага тыпу ў беларускай мове можа быць выражана мноствам спосабаў. Акрамя пабуджальных па мэце выказвання сказаў з выказнікам, выражаным пры дапамозе дзеяслова ў форме загаднага ладу, значэнне пабуджэння да дзеяння могуць утрымліваць апавядальныя па мэце выказвання сказы з дзеясловамі ў форме абвеснага і загаднага ладу, канструкцыямі з інфінітывам, бяздзеяслоўнымі канструкцыямі.


1. Суконкіна, Н. М. Рэалізацыя катэгорыі пабуджальнасці на лексічным узроўні ў беларускай мове / Н. М. Суконкіна, В. Э. Зіманскі. // Наука – образованию, производству, экономике: материалы 74-й Региональной научно-практической конференции преподавателей, научных сотрудников и аспирантов, Витебск, 18 февраля 2022 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: Е. Я.Аршанский (гл. ред.) [и др.]. – Витебск: ВГУ имени П. М. Машерова, 2022. – С. 219–220. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/31694 (дата обращения: 19.03.2023).

2. Маслова, А. Ю. Коммуникативно-семантическая категория побудительности и ее реализация в славянских языках (на материале сербского и болгарского языков в сопостовлении с русским) : автореф. дис. … канд. филол. наук / А. Ю. Маслова. – М. , 2005. – 40 с.

3. Праўдзін, В. А. Іду насустрач… : апавяданні, раман / Віктар Праўдзін. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. – 487 с.